

## ЗАЎТРА Ў НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ -- ЮБІЛЕЙНЫЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ

*Праграма мерапрыемстваў*

*$11^{00}$ – $13^{30}$ Знаёмства з універсітэтам (гал. корпус, рэктарат, вул.Савецкая, 104)*

*$15^{30}$ – $16^{30}$ Урачысты сход (актавая зала універсітэта, вул. Савецкая, 108)*

*$17^{00}$ – $18^{15}$ Святочны канцэрт (актавая зала універсітэта, вул.Савецкая, 108)*

*$19^{00}$ Студэнцкая дыскатэка (вул.Савецкая, 108)*


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

*№ 12,13(968-969) | ПЯТНІЦА, 1 кастрычніка 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная*


## НА ВЯДУЧЫХ ПАЗІЦЫЯХ

**Л.А.ШАМЯТКОЎ, рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі**

Гісторыя пастаянна насычаецца новымі фактамі, датамі, падзеямі. Сёлетняя яе старонка мае асаблівую адметнасць для вышэйшай школы Гомельшчыны. Наш шматтысячны калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў шырока адзначае 70-годдзе з дня прыняцця пастановы ЦВК БССР аб адкрыцці ў Гомелі аграпедагагічнага інстытута – першай ВНУ ў рэгіёне і 30-годдзе другога ў рэспубліцы універсітэта, створанага на базе былога Гомельскага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава.

Нагадаю аб першых кроках на шляху свайго станаўлення маладой вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся. Ужо ў 1930 годзе Калегія Народнага камісарыята адукацыі БССР прыняла рашэнне аб яе прафіляванні па трох напрамках – сацыяльна-гістарычнаму, літаратурна-лінгвістычнаму і фізіка-тэхнічнаму. Да 1933 года інстытут рыхтаваў настаўнікаў для школ калгаснай моладзі з двухгадовым тэрмінам навучання. Затым ён быў пераўтвораны ў педагагічны інстытут. Яго дыпломы выдаваліся пасля трохгадовай вучобы.

Умовы для падрыхтоўкі маладых кадраў пастаянна паляпшаліся. Уводзіліся новыя вучэбныя карпусы і інтэрнаты, будаўніцтва якіх знаходзілася пад пастаянным кантролем партыйных органаў і СНК БССР. У інстытут накіроўваліся



вопытныя выкладчыкі на большасць яго вядучых кафедраў. На працягу некалькіх гадоў тут існаваў таксама польскі сектар.

У 1934 годзе інстытут перайшоў на чатырохгадовую праграму навучання і рыхтаваў выкладчыкаў-прадметнікаў для сярэдніх школ, тэхнікумаў і рабфакаў па матэматыцы, фізіцы, хіміі і прыродазнаўству. У яго структуру ўваходзілі дзённы і вячэрні інстытуты, завочны і польскі сектары, дзённы і вячэрні рабфакі ў г.Рэчыцы. У склад польскага сектара ўваходзілі біялагічнае і фізічнае аддзяленні.

Вячэрні інстытут аб'ядноўваў матэматычнае, фізічнае, хімічнае, біялагічнае і дашкольнае аддзяленні. На першых двух курсах навучалася звыш 300 студэнтаў. Да практычнай педагагічнай дзейнасці іх рыхтавалі 2 прафесары, 3 дацэнты і столькі ж асістэнтаў, 1 выкладчык і 11 сумяшчальнікаў.

Акрамя педагагічнага ў Гомелі некаторы час існаваў настаўніцкі інстытут. Па стану на 1 лістапада 1939 года ў першым з іх навучалася 850 студэнтаў, у другім – 310. У абодвух інстытутах працавала 90 выкладчыкаў.

5 сакавіка 1939 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР інстытуту было прысвоена імя праслаўленага лётчыка В.П.Чкалава, чый лёс пэўны час быў звязаны з Гомелем.

За гады свайго існавання Гомельскі педінстытут выпусціў 12591 спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

У пасляваенны перыяд вышэйшая адукацыя ў Беларусі пастаянна ўдасканальвалася і развівалася. Вялікіх поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і вучоных па самых розных галінах ведаў дасягнуў і Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава. Заслужанай адзнакай гэтага ўзроўню з'явілася прыняцце пастановы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 14 сакавіка 1969 года аб пераўтварэнні інстытута ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Гэта пастанова пачала ажыццяўляцца з 1 мая таго ж года.

Адным з актыўных ініцыятараў адкрыцця ў Гомелі другога ў Беларусі універсітэта з'явіўся вядомы савецкі матэматык акадэмік АН БССР С.А.Чуніхін.

Урачыстае адкрыццё ГДУ адбылося 24 мая 1969 года. Яго першым рэктарам быў назначаны член-карэспандэнт АН БССР У.А.Белы, які да гэтага ўзначальваў акадэмічны Інстытут механікі металапалімерных сістэм і ў хуткім часе быў абраны акадэмікам. Пасля яго пераходу на адну з кіруючых пасад Акадэміі навук Беларусі рэктарам нашага універсітэта назначылі летам 1973 года буйнога вучонага-фізіка доктара фізіка-матэматычных навук Б.В.Бокуця. За 16 гадоў няспыннай працы ў ГДУ ён стаў акадэмікам, заслужаным дзеячом навукі БССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, ардэнаносцам.

За вялікія дасягненні ў вывучэнні, навуковым даследаванні і прапагандзе культурнай спадчыны беларускага народа і, у прыватнасці, культурна-асветніцкай дзейнасці славутага гуманіста эпохі Адраджэння, усходнеславянскага і беларускага першадрукара Францыска Скарыны Савет

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

## ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ — ЖУРНАЛІСТАМ

За плённую працу ў беларускай журналістыцы і ў сувязі з 30-годдзем шматтыражнай газеты "Гомельскі універсітэт" узнагароджаны:

рэдактар газеты **БАЛОГА** Уладзімір Паўлавіч – Ганаровай граматай Беларускага саюза журналістаў;

карэспандэнт **ДУБЯК** Тамара Мікалаеўна – Ганаровай граматай сакратарыята абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў.

## КАЛЕГІ ПАВІНШАВАЛІ З ЮБІЛЕЕМ

Шаноўныя сябры!

Горача віншуем са знамянальнай падзеяй у Вашай прафесійнай дзейнасці – 30-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара газеты "Гомельскі універсітэт". Яе старонкі сталі своеасаблівым летапісам станаўлення, развіцця і значных дасягненняў вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў, у праваздзенні фундаментальных навуковых даследаванняў, ва ўзбагачэнні беларускай культуры і народнага мастацтва, у прапагандзе фізічнай культуры і спорту.

Жадаем Вам і ў будучым заставацца вернымі свайму журналісцкаму прызванню, змястоўнымі і цікавымі публікацыямі радаваць сваіх шматлікіх чытачоў.

**Калектыў рэдакцыі газеты "Вячэрні Гомель".**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры эканамічных тэорый* ***БОБРЫК*** *Уладзімір Ільіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## ЗА ВЫДАТНУЮ ВУЧОБУ – ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

На падставе рашэння Савета універсітэта ад 2 верасня 1999 г. па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі 1998-99 навучальнага года назначаны імянныя стыпендыі:

**ІМЯ Я.КАРСКАГА**

з 1 жніўня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**ФУРСЕЕВУ** Яўгену – студэнту V курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова".

**ІМЯ П.БРОЎКІ**

з 1 жніўня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**АНДРЭЕВАЙ** Марыне – студэнтцы V курса юрыдычнага факультэта.

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**ЦЮРЫКАВУ** Міхаілу – студэнту V курса матэматычнага факультэта;

з 1 жніўня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**ШЧАРБАКОВУ** Івану – студэнту V курса эканамічнага факультэта;

з 1 жніўня 1999 г. па 31 снежня 2000 г.

**МАРОЗАВУ** Уладзіміру – студэнту V курса фізічнага факультэта з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць".

**ІМЯ Я.КУПАЛЫ**

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**КАГАН** Святлане – студэнтцы IV курса філалагічнага факультэта з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова";

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 сакавіка 2000 г.

**КОЦУР** Наталлі – студэнтцы V курса філалагічнага факультэта.

**ІМЯ К.КРАПІВЫ**

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**ЖУКАВАЙ** Марыне – студэнтцы IV курса геолага-геаграфічнага факультэта.

**ІМЯ А.С.ПУШКІНА**

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**КАЛІНІЧЭНКА** Наталлі – студэнтцы IV курса філалагічнага факультэта.

**ІМЯ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА**

з 1 ліпеня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**АСЯНІНАЙ** Ірыне – студэнтцы III курса эканамічнага факультэта;

з 1 жніўня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**СТРУКАВАЙ** Юліі – студэнтцы IV курса гістарычнага факультэта з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" (фінансуюцца Рэчыцкім гарадскім выканаўчым камітэтам дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

**ІМЯ Б.В.БОКУЦЯ**

з 1 жніўня 1999 г. па 31 студзеня 2000 г.

**ПАКАТАШКІНУ** Аляксандру – студэнту IV курса фізічнага факультэта (фінансуецца Гомельскай абласной адміністрацыяй Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай згоды дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

**Стыпендыя абласнога камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі**

**БЫКОЎСКАМУ** Валерыю – студэнту III курса біялагічнага факультэта.

**Стыпендыя прафкома студэнтаў ГДУ:**

**КРАЖАВУ** Андрэю – студэнту IV курса юрыдычнага факультэта;

**ЛАРЧАНКА** Юліі – студэнтцы IV курса факультэта фізічнай культуры;

**ВАЛОШЫНАЙ** Наталлі – студэнтцы V курса філалагічнага факультэта.

# НА ВЯДУЧЫХ ПАЗІЦЫЯХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністраў БССР 29 лістапада 1988 года прысвоіў яго імя нашаму універсітэту.

Сёння Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны з'яўляецца буйнейшым вучэбна-навуковым і культурным цэнтрам Беларускага Палесся. Каля 30 тысяч выпускнікоў ГДУ, сярод якіх філолагі, гісторыкі, юрысты, матэматыкі, фізікі, геолагі, біёлагі, эканамісты, спецыялісты фізічнай культуры, паспяхова працуюць у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, у навукова-даследчых інстытутах і падраздзяленнях, у розных арганізацыях і на прадпрыемствах не толькі нашай краіны, але і далёка за яе межамі. Многія былыя выхаванцы старэйшай на Гомельшчыне вну сталі шырокавядомымі вучонымі, займаюць кіруючыя пасады ў дзяржаўных органах кіравання.

Цяпер ва універсітэце налічваецца 13 факультэтаў і 47 кафедраў. Навучанне вядзецца па 27 спецыяльнасцях і 45 спецыялізацыях. Навучальны працэс забяспечваюць звыш 500 выкладчыкаў, сярод якіх акадэмік і 2 члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 31 доктар і 235 кандыдатаў навук, г.зн. больш палавіны выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і званні. Для параўнання скажам: на час адкрыцця універсітэта налічвалася 22 кафедры, на якіх працавала 244 выкладчыкі.

Пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый у нас пастаянна абнаўляецца з улікам патрэб рэгіёна ў неабходных кадрах. Так, за апошнія тры гады адкрыта 10 новых спецыяльнасцей. Па просьбе Гомельскага аблвыканкома была пачата падрыхтоўка юрыстаў, псіхолагаў, спецыялістаў па замежных мовах. Толькі з 1990 года ў нас з'явілася 20 новых спецыялізацый. Папаўненне кадрамі вышэйшай кваліфікацыі (кандыдатамі і дактарамі навук) праводзіцца за кошт павышэння навуковай кваліфікацыі ўласных выкладчыкаў без запрашэння спецыялістаў з іншых месц. Падрыхтоўка навуковых кадраў ва універсітэце вядзецца па 55 спецыяльнасцях. З 1990 года на цяперашні час выкладчыкамі ГДУ абаронена 25 доктарскіх і 125 кандыдацкіх дысертацый. Росту навуковага патэнцыялу ў пэўнай ступені спрыяе і тое, што пры універсітэце адкрыта 4 спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Навуковыя даследаванні ў нас праводзяцца праз сістэму навукова-даследчага сектара. Створаны такія буйныя падраздзяленні як праблемная навукова-даследчая лабараторыя перспектыўных матэрыялаў, лінгвістычная навукова-даследчая лабараторыя, навукова-даследчая лабараторыя сістэмнага праграміравання, навукова-даследчыя лабараторыі матэматычнага мадэліравання складаных сістэм, лазернай тэхналогіі, гідрагеалогіі і гідрагеахіміі. Даследаванні праводзяцца па 18 навуковых накірунках, якія адпавядаюць профілю выпускаемых спецыялістаў, а таксама прыярытэтным напрамкам па Рэспубліцы Беларусь.

Ва універсітэце сфарміраваліся і паспяхова развіваюцца навукова-педагагічныя школы па актуальных накірунках даследаванняў. Шырокавядомай стала гомельская школа алгебраістаў на чале з аўтарам гэтых радкоў. Найбольш эфектыўнымі можна назваць таксама школы па оптыцы і акустыцы крышталяў, фатоніцы і квантавай электроніцы, якая была створана акадэмікам Б.В.Бокуцем і працягвае паспяхова развівацца пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.М.Сердзюкова; па стварэнню новых перспектыўных матэрыялаў, узначальваемая прарэктарам на навуковай рабоце, прафесарам Д.Р.Лінам і прафесарам І.М.Мельнічэнкам; па фізіцы высокіх энергій і элементарных часціц на чале з прафесарам М.В.Максіменкам; па камп'ютэраметрыі і імітацыйнаму мадэліраванню вылічальных сістэм пад кіраўніцтвам прафесара І.В.Максімея. Вельмі добрыя вынікі маюць навуковыя школы па эканамічнай тэорыі і метадалогіі эканамічнай навукі (навуковы кіраўнік — прафесар М.В.Навучыцель); па беларускай лексікаграфіі (прафесар У.В.Анічэнка); па духоўнай спадчыне Гомельскага Палесся (прафесар І.Ф.Штэйнер). Плённа распрацоўваюцца праблемы педагогікі пад кіраўніцтвам акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі І.Ф.Харламава.

Мы маем трывалыя міжнародныя сувязі па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі, навукі, тэхнікі і вытворчасці. Сістэма адукацыі ГДУ набыла шырокае замежнае прызнанне, аб чым сведчыць стварэнне і паспяховае функцыянаванне Франка-Беларускага інстытута кіравання. Трывалымі і дзейснымі сталі дагаворы па падрыхтоўцы спецыялістаў і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з КНР, Польшчай, Францыяй, Англіяй, Германіяй, Італіяй, краінамі СНД.

Наш універсітэт набыў вядомасць і як культурны цэнтр. На яго базе двойчы праводзіўся міжнародны студэнцкі фестываль з удзелам студэнтаў многіх краін. Лепшыя студэнцкія калектывы нашага універсітэта носяць ганаровае званне народных. З гастрольнымі канцэртамі яны выязджалі ў Італію, Францыю, Германію, Англію і іншыя краіны блізкага і далёкага замежжа.

Па праву мы ганарымся дасягненнямі сваіх мацнейшых спартсменаў. Іх выступленні на спаборніцтвах самага высокага рангу прынеслі вядомасць універсітэту на ўсіх кантынентах планеты.

У канцы мінулага года дзяржаўная камісія правяла атэстацыю Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны і прыйшла да высновы, што па сваіх паказчыках ён адыгрывае цяпер вядучую ролю ў Гомельскім рэгіёне.

Да сваіх юбілейных урачыстасцей мы падышлі з пачуццямі глыбокага задавальнення. Гэта выклікана той высокай адзнакай, якой ацэнена дзейнасць універсітэта. Указам Прэзідэнта краіны яму прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Калектыў ГДУ ўдастоены Ганаровай граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, а аўтар гэтых радкоў -- Падзякі Прэзідэнта краіны А.Р.Лукашэнкі. Прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін і загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання прафесар І.В.Максімей узнагароджаны медалём "За працоўныя заслугі", а загадчык кафедры беларускай мовы, доктар філалагічных навук А.А.Станкевіч — медалём Францыска Скарыны.

Па заслугах ацэнена творчая і актыўная праца многіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў Міністэрствам адукацыі краіны, выканаўчымі камітэтамі і саветамі дэпутатаў.

Наш універсітэцкі калектыў з надзеяй глядзіць у будучыню, імкнецца стварыць неабходныя ўмовы для далейшага прагрэсу ў надыходзячым XXI стагоддзі. Мы зробім усё неабходнае, каб і ў далейшым заставацца на перадавых пазіцыях у сістэме вышэйшай школы нашай краіны.

Зараджэнне традыцый

# ЯК ГЭТА ПАЧЫНАЛАСЯ...

Упершыню гамяльчане ўбачылі калону дэманстрантаў пад эмблемай нашага універсітэта 1 мая 1969 года. 1 верасня па-урачыстаму пачаўся першы універсітэцкі навучальны год. Гэта ўрачыстасць стала традыцыйнай, праводзіцца і сёння, а ў тыя далёкія гады рабіліся толькі першыя спробы ў вышэйшай школе СССР пераўтварыць пачатак вучобы ў свята. Па ўказанню першага рэктара універсітэта члена-карэспандэнта АН БССР У.А.Белага мы (аўтару гэтых радкоў давялося ў той перыяд узначальваць камсамольскую арганізацыю універсітэта і быць прыналежным да станаўлення і развіцця многіх слаўных традыцый) знаёміліся з правядзеннем такіх дзён у МДУ імя М.В.Ламаносава, Фізіка-тэхнічным інстытуце і іншых вну краіны.

Першыя ўрачыстасці прайшлі па наступнаму сцэнарыю. Пакуль студэнты строіліся на ўрачыстую лінейку, ад Вечнага агню каля помніка загінуўшым воінам і партызанам у гады Вялікай Айчыннай вайны на плошчы Працы стартавала лёгкаатлетычная эстафета, у якой удзельнічалі лепшыя студэнты універсітэта. Яны неслі факел, якім запальвалі Чашу Ведаў, што стаяла перад застыўшымі ў страі студэнтамі і выкладчыкамі. Выносіўся сцяг універсітэта, сцяг камсамольскай арганізацыі, памятныя сцягі, якімі быў узнагароджаны калектыў ГДУ, сцягі, заваяваныя студэнцкімі будаўнічымі атрадамі ў перыяд трэцяга працоўнага семестра.

Студэнтаў-першакурснікаў віншавалі прадстаўнікі рэктарата, дзяржаўных і палітычных органаў, вядучыя вучоныя і заслужаныя педагогі, студэнты старшых курсаў. Ім уручаліся сімвалічныя студэнцкі білет, ключ ведаў і як будучым удзельнікам працоўных семестраў — кельня. Гучалі словы студэнцкай клятвы, выконваўся гімн студэнтаў, гучаў першы званок, які даваў адзін з вядомых выкладчыкаў вну, і пасля гэтага пачыналіся працоўныя будні.

З першых дзён была карпатлівая вучоба, устанаўліваўся жорсткі кантроль за набыццём ведаў студэнтамі. Усё гэта адлюстроўвалася не толькі ў заліковых кніжках і экзаменацыйных ведамасцях, але і ва ўсемагчымых графіках, пачынаючы з наведвання заняткаў, здачы бягучых экзаменаў і залікаў, грамадскага экзамена па дысцыпліне курса і заканчваючы графікам удзелу выкладчыкаў і студэнтаў у навукова-метадычнай і даследчай рабоце. Ва універсітэце працавалі саветы выдатнікаў, студэнцкага навуковага таварыства, маладых вучоных, якія арганізоўвалі і кантралявалі работу студэнтаў. Запомніўся першы універсітэцкі вечар, прысвечаны вынікам НДРС. Кожны з удзельнікаў, які атрымаў пэўныя вынікі ў навуковых даследаваннях, быў узнагароджаны граматай і каштоўным падарункам. Падарункі былі розныя, але кожны атрымаў камплект кніг па абранай спецыяльнасці з дароўным надпісам і подпісам рэктара. Гэта памяць на ўсё жыццё.

Арганізацыя навучальнага працэсу суправаджалася наладжваннем быту, вольнага часу студэнтаў і выкладчыкаў. Было створана праўленне клуба мастацкай самадзейнасці, за факультэтамі былі замацаваны ўсе суботнія і святочныя вечары, выезды факультэтаў у раёны і гарады вобласці. Дзякуючы гэтаму пра універсітэт даведаліся і загаварылі аб ім далёка за межамі вобласці. Вынікі конкурсаў паміж факультэтамі падводзіліся ў канцы кожнага навучальнага года з узнагароджваннем пераможцаў. Клопатам аб будучым свайго выхаванца было стварэнне факультэта грамадскіх прафесій, на якім пры жаданні кожны студэнт мог атрымаць другую грамадскую прафесію — лектара, кіраўніка гуртка мастацкай самадзейнасці, трэнера і суддзі па відах спорту і інш.



Фотаздымак з сямейнага архіва. І.Ф.Эсмантовіч — важак універсітэцкай камсамольскай арганізацыі.

Ва універсітэце дзейнічаў штаб працоўных спраў, які не толькі рыхтаваў работу студэнцкіх атрадаў у перыяд летніх канікул, але і мог аказаць дапамогу ў паляпшэнні свайго матэрыяльнага становішча на працягу навучальнага года.

Студэнты шэфствавалі над сельскімі школамі ў вёсках Дудзічы, Дзербічы і Халочча Чачэрскага раёна, супрацоўнічалі з дзіцячымі пакоямі міліцыі, пры домакіраўніцтвах, удзельнічалі ў ахове грамадскага парадку.

Для актывізацыі работы кафедр, факультэтаў, усяго прафесарска-выкладчыцкага саставу Саветам універсітэта было прынята рашэнне аб правядзенні выязных пасяджэнняў кафедр, саветаў факультэтаў і інш. Ніводнае з гэтых мерапрыемстваў не праходзіла без актыўнага ўдзелу студэнтаў.

Усе гэтыя пачынанні праводзіліся ў рамках спаборніцтва, якім кіравалі рэктарат, партком, камітэт камсамола і прафком. Яны былі накіраваны на выхаванне духу сапернiцтва, жадання быць наперадзе ва ўсіх формах работы, якая праводзілася ў ГДУ. Так праходзіла станаўленне маладога універсітэта, нараджаліся яго традыцыі.

**І.ЭСМАНТОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

## НАША БІЯГРАФІЯ: ГОД ЗА ГОДАМ

**1929**

Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Гомелі аграпедагагічнага інстытута з прафіляваннем па сацыяльна-гістарычнаму, літаратурна-лінгвістычнаму і фізіка-тэхнічнаму накірунках.



**1941-1944**

У час Вялікай Айчыннай вайны педагагічны інстытут, які насіў імя В.П.Чкалава, быў эвакуіраваны ў горад Кіраў. Тут, а таксама ў г.Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад) нашы студэнты працягвалі навучанне.

**1969**

На падставе пастановы ўрада ад 31 сакавіка 1969 года з 1 мая 1969 г. на базе Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава быў адкрыты Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Яго рэктарам назначылі вядомага вучонага ў галіне механікі металапалімерных сістэм кандыдата тэхнічных навук, члена-карэспандэнта АН БССР У.А.Белага.

У год адкрыцця універсітэта ў ім працавалі 244 выкладчыкі, сярод якіх былі 3 доктары, прафесары і 69 кандыдатаў навук, дацэнтаў. На гісторыка-філалагічным, механіка-матэматычным, фізічным, біёлага-глебавым, геалагічным факультэтах, факультэце фізічнага выхавання і па завочнай форме навучання займалася 4411 студэнтаў.

Вучэбны працэс ажыццяўляўся ў цяперашніх карпусах №№ 1, 2, 3, у памяшканні СШ № 8.

Універсітэт меў толькі два інтэрнаты.

З 1 верасня пачала выдавацца шматтыражная газета "Гомельскі універсітэт".

**1970**

З механіка-матэматычнага факультэта была выдзелена спецыяльнасць "Эканоміка працы" і на яе базе створаны эканамічны факультэт.

У снежні пачало працаваць дзённае падрыхтоўчае аддзяленне.

Загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт М.М.Грынчык быў першым сярод выкладчыкаў ГДУ, хто абараніў доктарскую дысертацыю.

У аглядзе-конкурсе сярод універсітэтаў краіны, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У.І.Леніна, наш універсітэт заняў І-ае месца і быў узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР. У ГДУ было падрыхтавана 5 майстроў спорту СССР, 54 кандыдаты ў майстры і першаразраднікі. У састаў зборных каманд рэспублікі ўваходзілі 33 студэнты ГДУ, 7 з'яўляліся кандыдатамі ў зборную СССР.

**1971**

На сямі факультэтах: фізічным, механіка-матэматычным, геалагічным, эканамічным, біёлага-глебавым, гісторыка-філалагічным і факультэце фізічнага выхавання на стацыянары займаліся амаль 3 тыс. студэнтаў і каля 2 тысяч — завочна. Свае веды і вопыт студэнтам перадавалі 18 дактароў навук, прафесараў і больш за 100 кандыдатаў навук.

Пачалося будаўніцтва пяціпавярховага вучэбна-лабараторнага корпуса па вул. Савецкай, 104, 156-кватэрнага інтэрната.



**1972**

Рэктару ГДУ акадэміку АН БССР, прафесару У.А.Беламу была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР у галіне навукі і тэхнікі.

## ПАМЯТАЮ ВЕРАСЕНЬ 69-га...

Трыццаць гадоў прайшло з той памятнай вераснёўскай раніцы 1969 года, калі я, узрушаны, усхваляваны і шчаслівы, апынуўся на парозе першага корпуса нашага універсітэта. Усё вакол было незвычайным — шматгалосы і радасны натоўп такіх жа нядаўніх абітурыентаў, усмешкі на тварах выкладчыкаў, урачыстыя словы рэктара — члена-карэспандэнта АН БССР У.А.Белага, музыка, вынас Ганаровага сцяга універсітэта... Не верылася, што пераадолены конкурс (шэсць чалавек на месца!), што стаў студэнтам не абы якой вну, а універсітэта — другога ў рэспубліцы пасля БДУ!

Потым пачаліся звычайныя студэнцкія будні: лекцыі і практычныя заняткі, залікі і экзамены, штогадовыя паездкі ў вёску "на бульбу" і ў студэнцкі будатрад, шчырыя размовы і гарачыя спрэчкі з сябрамі па інтэрнацкім пакоі. Спачатку захапіўся літаратурай і, прачытаўшы (як мне здавалася) усё аб жыцці і творчасці любімага паэта Сяргея Ясеніна, марыў "ашчаслівіць" чалавецтва ўласным даследаваннем яго паэзіі. Хутка, аднак, пераканаўся, што да мяне аб гэтым ужо паклапаціліся сапраўдныя "ясеніназнаўцы". Было і яшчэ адно захапленне — пад кіраўніцтвам вядомага фалькларыста прафесара П.П.Ахрыменкі пачаў запісваць (у тым ліку і з дапамогай маці) народныя песні "малой радзімы" — Брагіншчыны. А крыху пазней лёс звёў мяне з цікавым і незвычайным чалавекам — дацэнтам кафедры рускай і беларускай моў Тамарай Сямёнаўнай Янковай, якая нядаўна адзначыла сваё 80-годдзе. Напісаўшы пад яе кіраўніцтвам першую курсавую работу, зразумеў, што маё прызванне — мовазнаўства, неспазнаныя таямніцы жывой народнай мовы. На старшых курсах з'явілася мара аб аспірантуры, аб сур'ёзнай навуковай рабоце. Мара збылася, але не адразу — працаваў па размеркаванню, служыў у арміі. Ніколі не забуду дзень 25 лістапада 1975 года, калі ўпершыню з хваляваннем зайшоў у студэнцкую аўдыторыю. Але і зараз, як і раней, заўжды хвалююся перад сустрэчай з першакурснікамі: якое яно, новае папаўненне, як сустрэнуць, ці ўбачу цікавасць і прагу ведаў у вачах?

Няспынны, імклівы рух жыцця... 30 гадоў прайшло, а такое адчуванне, што ўсё гэта было зусім нядаўна. Гэты год — юбілейны для маёй alma mater, але і незвычайны, поўны асабістых хваляванняў і глыбокіх уражанняў: у маі абараніў доктарскую дысертацыю, а ў жніўні стаў студэнтам-першакурснікам мой сын, у якім шмат у чым пазнаю сябе. Няхай жа яго шлях у сценах роднага ГДУ будзе шчаслівым!

**Ул.КОВАЛЬ,**
**заг.кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

Разважае Купалаўская стыпендыятка

## ЯК СТАРОНКА МУДРАЙ ЖЫЦЦЁВАЙ КНІГІ

Кожны чалавек у сваім жыцці праходзіць розныя універсітэты, бо штохвілінна жыццё выпрабоўвае і вучыць нас. Так здарылася, што для мяне вельмі важным перыядам стала навучанне ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны.

"Што дае яно мне і чаму вучыць?" — запытаеце вы. Гэта дастаткова простае і ў той жа час даволі складанае пытанне.

Безумоўна, вучоба ў нашай установе — гэта выдатная магчымасць атрымаць веды з розных галін навукі, пашырыць свой кругагляд, набыць навыкі самастойнай працы, рэалізаваць сябе.

Для многіх з нас студэнцкія гады становяцца тым лёсавырашальным часам, калі мы набываем сваіх лепшых сяброў, сустракаем сваё першае моцнае каханне.

На маю думку, вельмі істотным, а можа, і самым галоўным, з'яўляецца тое, што, наведваючы заняткі па розных прадметах, мы не толькі набываем пэўныя веды, але і атрымоўваем сапраўдныя ўрокі Чалавечнасці, Дабрыні, Любові да Радзімы. Гэта яшчэ адна старонка вельмі мудрай і справядлівай жыццёвай кнігі, яшчэ адзін крок да таго, што мы называем Сталасцю, Дарасласцю. Бо менавіта ў гэты час заканчваецца фарміраванне асобы, канчаткова ўсталёўваюцца ідэалы, перакананні, жыццёвыя пазіцыі. Іменна тут упершыню кожны з нас пачынае ўсведамляць сябе як асобнага чалавека, які павінен самастойна адказваць за свае словы і ўчынкі.

Праходзім мы і праз надзвычайна карысную своеасаблівую школу чалавечых характараў, сустракаючыся з рознымі выкладчыкамі, што, бясспрэчна, вучыць нас разуменню іншых людзей, успрыняццю і асэнсаванню чужой псіхалогіі.

І таму вельмі хочацца верыць, што ўся гэтая навука абавязкова дапаможа нам з годнасцю вытрымаць яшчэ не адзін экзамен перад самым патрабавальным і строгім настаўнікам — Жыццём...

**Святлана КАГАН,**
**студэнтка IV курса філалагічнага факультэта.**

Сцвярджае выпускніца

## У ПРАФЕСІІ НЕ ПАМЫЛІЛАСЯ

Аб паступленні на юрыдычны факультэт ГДУ я марыла яшчэ ў школе: пасля 9-га класа перайшла ў клас з гуманітарным ухілам, а ў 11-м наведвала падрыхтоўчыя курсы пры універсітэце. Гэта вельмі дапамагло як пры здачы выпускных экзаменаў у школе, так і ўступных.

Сёння мне з цяжкасцю верыцца, што ад таго часу прайшло ўжо пяць гадоў. Па-ранейшаму да дробязей памятаю ўступныя экзамены, як хваляваліся мае сяброўкі і я сама. Па-сапраўднаму адчувала сябе шчаслівай, калі даведалася, што залічана на тады яшчэ гісторыка-юрыдычны факультэт.

Першы курс прайшоў нібы ў тумане — новыя знаёмствы, новыя прадметы, высокія патрабаванні, блытаніна ў калідорах. Было цяжка з-за недахопу вучэбнай літаратуры, таму шмат часу даводзілася праводзіць у бібліятэцы.

На старшых курсах вучыцца стала лягчэй: з'явіўся пэўны багаж вопыту, упэўненасць у сваіх сілах. Не магу назваць любімы прадмет або любімага выкладчыка. Хаця не, напэўна, крыху пакрывіла душой. Штосьці было больш складаным, штосьці давалася лягчэй, але сімпатыі заўсёды заставаліся на баку крымінальна-прававых дысцыплін, што вызначыла для мяне выбар спецыялізацыі.

Закончана вучоба ва універсітэце, і я з упэўненасцю магу сказаць, што не памылілася ў выбары. Мяне навучылі многаму. Перш за ўсё — больш адказным адносінам да жыцця, да неабходнасці ўзважваць кожнае прынятае рашэнне, быць больш патрабавальнай да сябе.

Вельмі рада, што юрыдычны факультэт, як і іншыя, вытрымаў атэстацыйны экзамен, што адкрыла больш шырокія гарызонты і студэнтам, і выкладчыкам.

Пасля ўсяго сказанага, напэўна, не цяжка здагадацца, чаму я вырашыла застацца для навучання ў аспірантуры — проста не магу расстацца са сваім універсітэтам.

У дзень знамянальнага юбілею ГДУ хачу пажадаць, каб ён і далей трымаў высокую планку ўзроўню ведаў, прафесіяналізму выкладчыкаў, заставаўся адным з культурных цэнтраў нашага горада.

**Т.АФОНЧАНКА,**
**выпускніца юрыдычнага факультэта 1999г.**

## НАША БІЯГРАФІЯ: ГОД ЗА ГОДАМ

**1973**

На эканамічным факультэце былі адкрыты дзве кафедры — арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі і галіновых эканомік.

У X Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне прымаў удзел выпускнік механіка-матэматычнага факультэта Уладзімір Семянчук.

Здадзены ў эксплуатацыю галоўны корпус універсітэта.



**1974**

Першы атрад маладых спецыялістаў — 108 чалавек — выпусціў эканамічны факультэт.

Загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі, доктар педагагічных навук І.Ф.Харламаў быў выбраны членам-карэспандэнтам АПН СССР.

Здадзены ў эксплуатацыю сяміпавярховы будынак інтэрната па вул.Савецкай.

**1975**

За шматгадовы актыўны ўдзел у будаўніцтве, меліярацыі зямель і высокія паказчыкі ў вучобе, вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці камсамольская арганізацыя ГДУ ўзнагароджана памятным Чырвоным сцягам ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР.

У маі універсітэт атрымаў у падарунак выдатную бібліятэку прафесара МДУ імя М.В.Ламаносава І.М.Бяляўскай, якую яна збірала на працягу 40 гадоў і завяшчала універсітэту, адкрытаму на яе радзіме.

**1976**

Для фізічнага факультэта Міністэрства адукацыі СССР зацвердзіла індывідуальны вучэбны план. Такі план быў уведзены ў вну Беларусі ўпершыню.

За поспехі ў развіцці навукі і вышэйшай адукацыі, падрыхтоўцы і выхаванні кадраў спецыялістаў загадчыку кафедры беларускай мовы прафесару У.В.Анічэнку было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР, прарэктару па навуковай рабоце, прафесару М.В.Навучыцелю — званне заслужанага работніка вышэйшай школы Беларускай ССР.

**1977**

На геалагічным факультэце быў створаны мінералагічны музей.

На Гомельшчыне працавала XI Міжнародная школа маладых вучоных па фізіцы высокіх энергій і рэлятывісцкай ядзернай фізіцы. Разам з Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў (г. Дубна), Інстытутам фізікі АН БССР, Інстытутам механікі металапалімерных сістэм яе арганізатарам з'яўляўся і наш універсітэт.

**1978**

За вялікія заслугі ў развіцці навукі і тэхнікі, у падрыхтоўцы навуковых кадраў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці рэктару члену-карэспандэнту АН БССР Б.В.Бокуцю прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

**1979**

Універсітэт адзначыў сваё 10-годдзе. За гэты час вядучая вышэйшая навучальная ўстанова Беларускага Палесся падрыхтавала для народнай гаспадаркі 9545 маладых спецыялістаў. Значна павысіўся навукова-педагагічны патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ.

**1980**

Ва універсітэце адкрыўся археалагічны музей — першы музей такога тыпу ў навучальных установах Гомельшчыны.

Рэктар універсітэта Б.В.Бокуць выбраны акадэмікам, а прарэктар па вучэбнай рабоце Л.А.Шамяткоў — членам-карэспандэнтам АН БССР.

Студэнты факультэта фізічнага выхавання Аляксандр Фомчанка, Аляксандр Варабей і Мікалай

Лідэры

## КОЖНЫ РОБІЦЬ СВОЙ ВЫБАР

... Цяпер у Алега вельмі шмат сяброў. Прычым, з усёй Беларусі, а не толькі з г.Гомеля, дзе ён жыве і вучыцца. На чарговы дзень нараджэння, які адзначаў гэтым летам, атрымаў не адну сотню віншавальных паштовак і тэлеграм. Адкуль столькі?

На пытанне Алег Дзяргун, другакурснік эканамічнага факультэта, растлумачыў:

— Пазнаёміўся з многімі студэнтамі розных вну, навучэнцамі тэхнікумаў рэспублікі ў час разнастайных і цікавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца Беларускім Саюзам Моладзі, членам якога я з'яўляюся, вось і абмяняліся адрасамі. Гэтым летам я прымаў удзел у рабоце міжнароднага экалагічнага валанцёрскага лагера "Альба-парк—99". Вось ужо трэці год ён дзейнічае ў адным са старэйшых гарадоў Беларусі — Нясвіжы. Сёлета сюды з'ехаліся 70 юнакоў і дзяўчат рэспублікі. Гомельскую вобласць прадстаўлялі 8 чалавек, ад нашага універсітэта — я і другакурснік фізічнага факультэта Яўген Цяпугін.

Далей Алег з захапленнем працягваў расказ аб цікавых 18 жніўеньскіх днях, праведзеных на добраўпарадкаванні цэнтральнай часткі старажытнага парка. Брыгадамі па 12 чалавек у кожнай валанцёры штодзень да абеда вялі расчыстку яго тэрыторыі, падсыпалі прагулачныя дарожкі, устанаўлівалі інфармацыйныя шчыты. А пасля абеду ўсіх чакала незабыўная культурная праграма. Алег прызнаўся, што нават і не падазраваў, што ў нашай рэспубліцы так многа помнікаў даўніны, ёсць на што паглядзець. У час экскурсій яны пазнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі: Мірскім замкам, г.Навагрудкам, Слуцкай брамай, замкам Радзівілаў.

Такія формы арганізацыі працы і адпачынку, на думку А.Дзергуна, даюць вельмі шмат — моладзь адчувае сваю прыналежнасць да карыснай справы, вучыцца ініцыятыве, узаемаразуменню. А гэта ў наш час, калі на змену калектыўным творчым справам, цікавым грамадска-карысным мерапрыемствам прыйшлі няўпэўненасць маладых людзей у заўтрашнім дні, абыякавасць да свайго лёсу, нежаданне вучыцца і працаваць, надзвычай важна і каштоўна. Беларускі Саюз Моладзі, які з'яўляецца пераемнікам лепшых традыцый Ленінскага камсамола, выкарыстоўвае ў сваёй рабоце ўсё тое лепшае, што было назапашана маладзёжным рухам, ажыццяўляе свае асабістыя праграмы, накіраваныя на выхаванне духоўна паўнацэннай, фізічна здаровай моладзі, на яе сацыяльную абарону, рэалізацыю сваіх правоў. Вось чаму стаў актыўным яго членам студэнт эканамічнага факультэта А.Дзяргун, які ўзначальвае пярвічную арганізацыю БСМ у ГДУ.

Што канкрэтна робіць яна, пакуль яшчэ не вельмі шматлікая (яна налічвае звыш 40 чалавек), для студэнтаў універсітэта? Зрабіць моладзь сацыяльна актыўнай — такой бачыць перад сабой задачу як лідэр гэтай арганізацыі Алег. А для гэтага і самому яшчэ трэба вучыцца, набірацца пэўнага вопыту. Таму юнак заўсёды знаходзіць магчымасць стаць удзельнікам розных адукацыйных семінараў, праграм рэспубліканскага ўзроўню, якія праводзіць БСМ. Такіх, напрыклад, як "Стыль", "Праблема ВІЧ—СНІД і моладзь" і інш. Першы з названых дапамагае ствараць з ліку студэнцкай моладзі рэзерв кадраў, прафесійна падрыхтаваных да працы ў дзяржаўных, грамадска-палітычных структурах кіравання, другі — ставіць мэтай павышэнне ўзроўню інфармаванасці моладзі па пытаннях здаровага ладу жыцця, праблемах палавога выхавання, прафілактыкі наркаманіі, ВІЧ-інфекцыі. Цікавасць такіх семінараў у іх арганізацыі — гэта не нудныя лекцыі, а актыўныя гульні з разыгрываннем розных сітуацый, з анкетаваннем, выкананнем творчых заданняў.

Хутка ў г.Гомелі будзе праходзіць другі рэспубліканскі форум дзяцей і моладзі Беларусі, ініцыятарам якога з'яўляюцца АК БСМ і абласны савет Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі пры падтрымцы прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЭФ у Беларусі. У яго падрыхтоўцы актыўны ўдзел прымае і Алег Дзяргун. Арганізацыйных клопатаў хапае, бо праграма форуму — шырокая і цікавая. У яе ўваходзіць, у прыватнасці, кірмаш дзіцячых і маладзёжных праектаў, у час якіх здольныя маладыя таленты могуць паказаць сябе ў самых розных жанрах. Мэта форуму — даказаць, што моладзь можа сама ствараць сваё цікавае жыццё ўжо сёння, а не ў будучым, яна здольная і вучыцца, і зарабляць грошы, і рэалізоўваць свае ідэі. Ад студэнтаў ГДУ ў форуме прыме ўдзел першакурснік эканамічнага факультэта Ігар Барсукоў.

Дык ці патрэбна сёння маладому чалавеку якая-небудзь грамадская арганізацыя, такая, як, напрыклад, БСМ, дзе б ён праявіў сябе? Адказ на пастаўленае пытанне шукаць трэба яму самому. Яму выбіраць, ці будзе цікавым яго жыццё, як у Алега Дзергуна, ці аднастайным і шэрым.

**Т.ДУБЯК.**

Фотарэпартаж з "Дня ведаў"

# У АДКАЗЕ ЗА БУДУЧЫНЮ




... Ў іх яшчэ ўсё наперадзе. За пяць гадоў вучобы будзе шмат цікавага, нязведанага, усяго таго, з чаго складаецца студэнцкае жыццё. Ім, учарашнім абітурыентам, гэтая першавераснёўская сонечная раніца паклала пачатак таго вялікага шляху, які прывядзе да абранай прафесіі.

990 юнакоў і дзяўчат — такі сёлета значны па сваёй колькасці "дадатак" да студэнцкай сям'і ГДУ, які прыняты на вучобу па планаваму набору за дзяржаўны кошт. Нямала моладзі залічана на вучобу і на платнай аснове.

На традыцыйным свяце "Дзень ведаў", якое праходзіла каля першага вучэбнага корпуса, яны выглядалі па-сапраўднаму радаснымі і шчаслівымі. Асаблівую ўзнёсласць падзеі пасвячэння першакурснікаў у паўнапраўныя студэнты надавала святочная юбілейная атмасфера, у якой жыве зараз наш універсітэт: ён адзначыць 70-годдзе з дня стварэння аграпедагагічнага інстытута, затым пединстытута імя В.П.Чкалава,на базе якога потым быў утвораны другі па значнасці ў рэспубліцы універсітэт, што вось ужо на працягу 30 гадоў рыхтуе кадры маладых спецыялістаў для сярэдніх школ, розных арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў.

Урачыстасць пачалася для першакурснікаў з кароткага знаёмства з гісторыяй ГДУ, студэнтамі якога ім пашчасціла стаць. Затым іх шчыра павіншаваў і пажадаў поспехаў ва ўсіх справах студэнцкага жыцця рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў. Студэнцкая пара, — зазначыў ён, — найлепшы час не толькі для плённай вучобы, але і духоўнага ўзбагачэння асобы маладых людзей, магчымасці для чаго ёсць і ў ГДУ, і ў г.Гомелі з яго культурнымі ўстановамі. Л.А.Шамяткоў уручыў сімвалічны студэнцкі білет першакурсікам Аляксандры Цімафеевай з гістарычнага факультэта і Аляксандру Рудчанку з эканомфака як сведчанне таго, што цяпер нядаўнія абітурыенты па праву лічацца студэнтамі **(здымкі ўверсе і злева)**.




Ужо звыш дзесяцігоддзя з гонарам носіць Гомельскі універсітэт імя гуманіста эпохі Адраджэння, усходнеславянскага і беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Шанаваць плённую спадчыну Скарыны, глыбока вывучаць і даследаваць яе заклікаў першакурснікаў у сваім выступленні заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, доктар філалагічных навук, прафесар У.В.Анічэнка. Ён уручыў Летапіс студэнтцы матфака Жане Бабковай і Віталю Герасімовічу з эканамічнага факультэта.




У свяце прыняў удзел першы намеснік старшыні аблвыканкома С.С.Сідорскі, які звярнуўся да першакурснікаў з найлепшымі пажаданнямі ў авалодванні ведамі.

Нямала адкрыццяў чакае першакурснікаў у Краіне ведаў, сімвалічны ключ ад якой як своеасаблівую эстафету ад старэйшага пакалення да сваёй маладой змены пяцікурсніца матфака Антаніна Трафімец уручыла першакурсніку юрыдычнага факультэта Кірылу Ковалю **(унізе злева)**. У яго выступленні ў адказ прагучала ўпэўненасць, што студэнты набору 1999 г. будуць гэтак жа, як і іх папярэднікі, садзейнічаць росквіту і славе ГДУ ў вучэбнай і навуковай дзейнасці, грамадскім жыцці і спорце, працягваць традыцыі вну, якая мае багатую гісторыю.

Гучаць узнёслыя словы Ф.Скарыны аб важнасці спасціжэння навукі, і паклікаў у вучэбныя аўдыторыі першакурснікаў універсітэцкі званок, які даюць пяцікурснік геолага-геаграфічнага факультэта Алег Курашоў і студэнтка першага курса эканомфака Кацярына Бароўская **(унізе справа)**.

Сёлетнія першакурснікі пачынаюць студэнцкае жыццё на рубяжы тысячагоддзяў. Якім будзе наступнае XXI стагоддзе — залежыць непасрэдна ад іх, і яны з адчуваннем вялікай адказнасці за гэта будуць авалодваць ведамі.

У добры шлях!

**Т.НІКАЛАЕВА.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**



## НАША БІЯГРАФІЯ: ГОД ЗА ГОДАМ

грамадскі дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі.

**1989**

За вялікія заслугі па развіццю фізічнай культуры і спорту ў рэспубліцы, падрыхтоўцы настаўнікаў фізічнага выхавання агульнаадукацыйных школ і спартсменаў высокага класа прысвоена званне "Заслужаны трэнер Беларускай ССР" дэкану факультэта фізічнай культуры Б.М.Зайцаву і старшаму трэнеру універсітэта па фехтаванню В.В.Лісоўскаму.

**1990**

На савеце працоўнага калектыву універсітэта рэктарам ГДУ выбраны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

**1991**

На гістарычным факультэце адкрылася новая спецыяльнасць — "Правазнаўства".

ГДУ заключыў двухбаковае пагадненне з Пекінскім упраўленнем вышэйшай адукацыі і ўстанавіў узаемакарысныя кантакты з вну Кітая — Пекінскім сталічным педагагічным універсітэтам і Янчжоўскім педінстытутам. Праводзіўся абмен дэлегацыямі нашых і кітайскіх вучоных. Спецыялісты з далёкай усходняй краіны прыязджалі на стажыроўку ў ГДУ, нашы — у Пекін, у ГДУ вучацца кітайскія студэнты.

**1992**

Упершыню адразу 6 выхаванцаў ГДУ прадстаўлялі Рэспубліку Беларусь на XXV летніх Алімпійскіх гульнях у Барселоне.

**1993**

Адбылося ўрачыстае адкрыццё музея-лабараторыі Францыска Скарыны, дзе сабрана шмат экспанатаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці вялікага асветніка і вучонага. На знамянальнай падзеі прысутнічалі ганаровыя госці — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Беларусі А.Смулэк, мітрапаліт Мінскі і Слуцкі патрыяршы экзарх усея Беларусі, член Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы Філарэт, група вучоных вну Кітая, з якімі наш універсітэт меў дагавор аб навуковым супрацоўніцтве.

У час візіту дэлегацыі ГДУ ў складзе рэктара Л.А.Шамяткова, першага прарэктара М.В.Селькіна, дэкана факультэта прафарыентацыі і падрыхтоўкі да вучобы ў вну А.У.Гаўрылюка ў французскі горад Клермон-Феран быў падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве паміж мясцовым універсітэтам і ГДУ.

Дэлегацыя ГДУ на чале з першым прарэктарам М.В.Селькіным наведала шатландскі горад Абердзін, дзе адбыліся перамовы з кіраўніцтвам мясцовага універсітэта аб устанаўленні двухбаковых сувязей у справе абмену вопытам па падрыхтоўцы спецыялістаў і правядзення навуковых даследаванняў.

Рэктар ГДУ член-карэспандэнт АН Беларусі А.Л.Шамяткоў атрымаў ганаровы дыплом Міжнароднага біяграфічнага цэнтра, які знаходзіцца ў Кембрыджы (Англія). Цэнтр выдае серыі энцыклапедычных даведнікаў па розных галінах навукі і культуры, у якія ўключаны і біяграфічныя дадзеныя аб навуковай дзейнасці Л.А.Шамяткова. Гэта — сведчанне высокага навуковага аўтарытэту рэктара ГДУ, чые працы ў галіне матэматыкі вядомы далёка за межамі нашай краіны.

**1994**

Споўнілася 20 гадоў з дня арганізацыі ў ГДУ лабараторыі вылічальнай тэхнікі, якая затым была рэарганізавана ў інфармацыйна-вылічальны цэнтр.

Споўнілася 20 гадоў завочнаму факультэту. За гэты час на ім было падрыхтавана звыш 10 тыс. спецыялістаў.

Адбылося адкрыццё сумеснай беларуска-італьянскай праграмы па стварэнню псіхалагічнай службы Гомельскай вобласці і падрыхтоўцы кадраў для яе. Такім чынам, ГДУ ўпершыню ўзяўся за навучанне студэнтаў новай спецыяльнасці. Пачалося плённае супрацоўніцтва з псіхолагамі Пізанскага універсітэта Італіі. Лекцыі пачаў чытаць дырэктар дэпартамента псіхолагаў прафесар універсітэта г.Пізы Гаэтана Барлета.

У ГДУ адбыўся першы ў

Слова першакурсніцы

## ЯШЧЭ ПЯЦЬ ГАДОЎ БУДЗЕМ РАЗАМ

Здзейснілася наша запаветная мара. Мы сталі першакурснікамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Мы — гэта нядаўнія ліцэісты Юля Міронычава, Надзя Скачкова, Наташа Асіпкова, Вольга Серышава, Віка Гарыленка, Таня Грыцэнка і інш., якія паспелі за два гады набрацца ведаў і пасябраваць як след. Так званы 11 "РБ" ("руска-беларускі") клас Гомельскага абласнога ліцэя ўвесь ліпень перажываў моцныя хваляванні, звязаныя са сваім паступленнем. Але ўсё аказалася намнога прасцей. Неабходных ведаў нам спаўна хапіла, на экзаменах не завальвалі, адносіны выкладчыкаў універсітэта былі добрыя. Таму без асаблівых праблем мы атрымалі "чацвёркі" і "пяцёркі" і сталі студэнтамі. За гэта вельмі ўдзячны нашым любімым настаўнікам Вользе Аркадзьеўне Кожавай, Маі Яфімаўне Рыскінай, Таццяне Анатольеўне Шыбанавай і ўсім тым, хто рыхтаваў нас да пакарэння такой вяршыні.

Мы адвучыліся два гады ў абласным ліцэі, але не збіраемся расставацца яшчэ як мінімум пяць гадоў.

**Ірына ЛАРЫЁНАВА,**
**студэнтка І курса філалагічнага факультэта.**

# РАВЕСНІК УНІВЕРСІТЭТА

Кёлета споўнілася 30 гадоў з дня адкрыцця ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны геолага-геаграфічнага факультэта. Ён вядзе сваю гісторыю ад заснаванага ў 1969 годзе геалагічнага факультэта, які на працягу больш двух дзесяцігоддзяў з'яўляецца адзіным цэнтрам падрыхтоўкі для Беларусі нацыянальных кадраў інжынераў геолагаў-гідрагеолагаў.

У ходзе свайго развіцця ў 1989 годзе факультэт пераўтвораны ў геолага-геаграфічны і з таго часу вядзе падрыхтоўку не толькі геолагаў, але і настаўнікаў геаграфіі, а з 1998 г. — і спецыялістаў у галіне экалогіі.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў дасягнуты дзякуючы добрасумленнай працы розных пакаленняў выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта.

Сёння факультэт з'яўляецца вядучым вучэбна-навуковым цэнтрам у Палескім рэгіёне Беларусі.

У складзе факультэта 3 кафедры, 2 навукова-даследчыя лабараторыі, геалагічны музей, 12 вучэбных кабінетаў і лабараторый, вучэбная геалагічная станцыя "Чонкі". У нас навучаецца каля 400 студэнтаў, адзін дактарант, 8 аспірантаў і саіскальнікаў. Педагагічную і навуковую работу на факультэце вядуць 36 выкладчыкаў, з іх — 2 прафесары, 14 кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, якія здольны выконваць работы, звязаныя з разведкай прэсных, мінеральных і прамысловых падземных вод, праводзіць геалагічнае абгрунтаванне і праектаванне буйнога інжынернага будаўніцтва; па геафізічных метадах пошукаў і разведкі месцанараджэнняў карысных выкапняў, якія могуць працаваць як у геафізічных навукова-даследчых установах, так і на разведцы розных карысных выкапняў, а таксама праводзіць даследаванні, звязаныя з інжынерным будаўніцтвам і гідрагеалогіяй; геаграфіі глебаў, зямельных рэсурсаў, меліярацыі; рацыянальнаму прыродакарыстанню і ахове прыроды.

За час свайго існавання факультэтам падрыхтавана больш 2 тысяч спецыялістаў. Многія з іх сталі вядомымі ў рэспубліцы вучонымі. Сярод іх — член-карэспандэнт НАН Беларусі, дырэктар Інстытута геалагічных навук А.А.Махнач, доктар навук В.Д.Парошын. Больш 20 кандыдатаў навук працуюць у розных навуковых і навукова-вытворчых установах. Гэта дырэктар інстытута ЦНДІВВР М.М.Чарапанскі і яго намеснік А.М.Грэчка, намеснік дырэктара інстытута "БелНІПІнафта" В.В.Шкандратаў, загадчык лабараторыі біягеахіміі і тэхнагенных радыенуклідаў інстытута радыялогіі М.І.Аўтушка, загадчык аддзела праектавання і распрацоўкі нафты "БелНІПІнафта" М.К.Карташ. На факультэце працуюць яго выпускнікі кандыдаты навук, дацэнт Г.А.Сербін, аўтар гэтых радкоў, ст.выкладчык А.П.Гусеў і першы аспірант факультэта дацэнт Ю.П.Іваноў.

Геолага-геаграфічны факультэт — адзін з буйных навуковых цэнтраў Гомельшчыны. Тэматыка асноўных накірункаў навуковых даследаванняў вызначана профілем падрыхтоўкі і практычнымі задачамі сучаснага грамадства. Рад дзяржбюджэтных і гаспдагаворных тэм выконваюцца па важнейшай тэматыцы.

На кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў вядзецца навукова-даследчая работа па дзяржаўнай праграме "Прыродакарыстанне і ахова акаляючага асяроддзя" (кіраўнік В.Г.Жогла). Супрацоўнікамі кафедры набыты значны вопыт у галіне матэматычнага мадэліравання геафільтрацыйных і геаміграцыйных працэсаў.

Кафедра геаграфіі займаецца праблемамі экалагічнай адукацыі і выхавання, выкладчыцкі калектыў працуе над стварэннем падручніка "Геаграфія Гомельскай вобласці". Прафесарам В.А.Вахрушавым падрыхтавана манаграфія "Камень у культуры народаў свету з даўніх часоў да нашых дзён".

Кафедра экалогіі праводзіць даследаванні па рэспубліканскай навуковай праграме "Геаэкасістэмы" (кіраўнік А.М.Кусянкоў).

Супрацоўнікамі факультэта толькі за апошнія 3 гады апублікавана больш 120 навуковых работ.

Выкладчыкі факультэта прымаюць удзел у міжнародных, рэгіянальных і рэспубліканскіх канферэнцыях. Сярод іх трэба адзначыць 7-ы Міжнародны конкурс эколагаў (1998, Італія), Міжнародную канферэнцыю па праблемах устойлівага развіцця (1997, Канада).

Наш факультэт неаднаразова з'яўляўся ініцыятарам і цэнтрам правядзення міжнародных канферэнцый па праблемах геаэкалогіі. Ён падтрымлівае сувязі з роднаснымі факультэтамі вышэйшых навучальных устаноў Расіі, Украіны і сваёй рэспублікі.

Далейшае развіццё факультэта звязана з умацаваннем матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэннем узроўню навуковых даследаванняў, пашырэннем сувязей з акадэмічнымі і вытворчымі ўстановамі.

**Г.СЕРБІН,**
**дэкан геолага-геграфічнага факультэта, дацэнт.**

# ПЕРАМОГА МАЛАДОГА ФІЗІКА

У канцы жніўня ва ўніверсітэце г.Таронта (Канада) праходзіла XXVI Генеральная асамблея Міжнароднага саюза радыёфізічных навук (URSI). У ёй прынялі ўдзел каля паўтары тысячы вучоных больш чым з 50 краін свету. За год да Генеральнай асамблеі Міжнародны саюз радыёфізічных навук аб'явіў сусветны конкурс сярод маладых вучоных для ўдзелу ў гэтай канферэнцыі. Адным з яго пераможцаў стаў кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт кафедры агульнай фізікі намеснік дэкана фізічнага факультэта Сяргей Анатольевіч Хахомаў. Ён прадставіў два даклады, прысвечаныя электрадынаміцы новых комплексных кампазітных матэрыялаў. Гэтыя даклады з'явіліся абагульненнем вынікаў даследаванняў, выкананых пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры агульнай фізікі доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Ігара Валянцінавіча Семчанкі сумесна з вучонымі Беларусі, Германіі і Фінляндыі.

Міжнародны саюз радыёфізічных навук — адна са старэйшых навуковых арганізацый свету. Генеральныя асамблеі саюза праходзяць рэгулярна раз у тры гады. На правядзенне наступнай Генеральнай асамблеі прэтэндавалі Кітай, Германія і Нідэрланды. У выніку галасавання чарговую XXVII асамблею вырашана правесці ў г.Маастрыхт (Нідэрланды).

**(Наш кар.)**



**На здымку: Прэзідэнт Міжнароднага саюза радыёфізічных навук Том Сеніор (справа) уручае дыплом пераможцы конкурсу маладых вучоных С.А.Хахомаву.**

**Нашы прыярытэты**

# АДУКАЦЫЯ ПА ЕЎРАПЕЙСКІХ СТАНДАРТАХ

Франка-Беларускі інстытут кіравання пры ГДУ створаны на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве паміж Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.Скарыны і Оверньскім універсітэтам Клермон — 1 (Францыя) ад 14 верасня 1993 г. і 20 ліпеня 1995 г.

У інстытуце кіравання рыхтуюцца спецыялісты-менеджэры для беларускіх прадпрыемстваў, якія актыўна выходзяць на еўрапейскі рынак. Адукацыя, якая поўнасцю адпавядае еўрапейскім стандартам, дазволіць нашым спецыялістам гаварыць на адной мове з іх партнёрамі ў краінах Еўропы, забяспечваючы выгаднае для беларускіх прадпрыемстваў супрацоўніцтва.

Працэс навучання ўключае два падрыхтоўчыя і тры асноўныя гады навучання. Падрыхтоўчыя гады прысвечаны інтэнсіўнаму вывучэнню французскай мовы. У канцы другога года студэнты могуць паўнацэнна слухаць лекцыі і працаваць на практычных занятках, якія праводзяцца французскімі выкладчыкамі. Вучэбныя планы наступных трох гадоў навучання распрацаваны на аснове вучэбных планаў універсітэцкага прафесіяналізаванага інстытута (Овернь, універсітэт Клермон — 1) і эканамічнага факультэта ГДУ.

Зараз у ФБІК навучаецца каля 90 студэнтаў Гомельскага дзярж-універсітэта.

**А.ГАЎРЫЛЮК,**
**садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання, дацэнт.**



**На здымку:**
**Рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў (справа) і садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання прафесар Морыс Шэневуа ў час падпісання дакументаў аб супрацоўніцтве.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## НАША БІЯГРАФІЯ: ГОД ЗА ГОДАМ

культурным жыцці вну Гомельшчыны Міжнародны фестываль моладзі "Арт-сесія" Гомель-94. Яго мэта — актывізацыя і развіццё творчых здольнасцей моладзі, прапаганда нацыянальнага мастацтва, знаёмства з маладзёжнымі творчымі калектывамі замежжа. У рамках фестывалю адбыўся юбілейны вечар ушанавання народнага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля ГДУ "Радзімічы", якому споўнілася 25 гадоў.

**1995**

У выніку плённага супрацоўніцтва ГДУ імя Ф.Скарыны і універсітэта г.Клермон-Феран пры садзейнічанні Пасольства Францыі і Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь быў адкрыты Франка-Беларускі інстытут кіравання, фінансаванне якога ажыццяўляе французскі бок.

Ва універсітэце адкрыты дзве новыя кафедры — французскай мовы; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Універсітэцкі санаторый-прафілакторый адзначыў сваё 20-годдзе. За гэтыя гады ў яго сценах атрымалі лячэнне і прайшлі аздараўленне тысячы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

**1996**

На базе ГДУ прайшоў Міжнародны кангрэс, прысвечаны 100-годдзю выдатнага псіхолага XX ст. Л.С.Выгоцкага. У ім прынялі ўдзел вучоныя-псіхолагі з далёкага і блізкага замежжа, вядомы гомельскай педагагічнай грамадскасці прафесар Г.Барлета з г.Пізы. Вялікую цікавасць да кангрэса праявілі студэнты і выкладчыкі нашага універсітэта.

Рашэннем ВАК Рэспублікі Беларусь пры ГДУ былі створаны 4 спецыялізаваныя саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Адбыўся першы ў гісторыі універсітэта выпуск маладых спецыялістаў, якія атрымалі прафесію юрыста.

У другі раз ва універсітэце прайшоў Міжнародны фестываль "Арт-сесія", у час якога была адкрыта выставачная зала ў галоўным корпусе.

**1997**

Спектаклем па п'есе гомельскага драматурга В.Ткачова "Шкірдзюкі займаюць абарону" універсітэцкі тэатр-студыя "Если бы..." (кіраўнік Г.Варонін) здаваў экзамен на атрыманне звання народнага самадзейнага калектыву. Рашэннем Калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь тэатру-студыі было прысвоена гэтае ганаровае званне.

Адбылося першае ўручэнне студэнтам Франка-Беларускага інстытута кіравання сертыфікатаў дыпломаў. Іх уручалі пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь пан Бернар Фасье, віцэ-прэзідэнт Оверньскага універсітэта па міжнародных сувязях, садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання прафесар Морыс Шэневуа.

Адбыўся першы ва універсітэце набор на новую спецыяльнасць — "Псіхалогія".

**1998**

Прадстаўнікі ўсіх шасці вну Гомельшчыны сустракаліся ў нашым універсітэце з кіраўнікамі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Сустрэча садзейнічала далейшаму ўмацаванню саюза Расіі і Беларусі, пленнаму супрацоўніцтву ў навуковай сферы, у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Споўнілася 10 год з дня прысваення ГДУ імя вялікага асветніка, першадрукара Ф.Скарыны. Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь падарыў музею-лабараторыі карціну беларускага і літоўскага жывапісца і графіка П.А.Сергіевіча "Ф.Скарына ў друкарні".

За шматгадовую плённую працу па прапагандзе дасягненняў у галіне культуры, літаратуры і мастацтва прарэктар ГДУ па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Ва універсітэце прайшоў трэці Міжнародны маладзёжны фестываль "Арт-сесія" Гомель'98, які на гэты раз быў самым прадстаўнічым. У ім прынялі ўдзел 14 творчых калектываў з 7 краін



## ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ТАЛЕНТАЎ І ДУХОЎНАГА ЎЗБАГАЧЭННЯ

У нашым універсітэце створаны комплекс аб'ектаў культуры, які служыць карыснаму правядзенню вольнага часу, рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў, развіццю студэнцкіх талентаў. У структуру комплексу ўваходзяць Культурны цэнтр з канцэртнай залай на 650 месцаў, перададзены на баланс універсітэта былы кінатэатр "Юбілейны" з вялікай і малой кінаканцэртнымі заламі адпаведна на 900 і 300 месцаў. Створаны цэнтр культуры і вольнага часу "Валатава" пры інтэрнаце № 4. У нас ёсць выставачная зала і маладзёжнае кафэ, а студэнцкі клуб налічвае звыш 40 творчых аб'яднанняў.

Ганаровае званне "народны" прысвоена студэнцкаму тэатру "Люстэрка", фальклорна-харэаграфічнаму ансамблю "Радзімічы", харавой капэле "Дзянніца", тэатру танца "Кактэйль", тэатру-студыі "Калі б...", тэатру фальклорнай песні "Пасад", фотаклубу "Палессе", студэнцкаму тэатру эстрадных мініяцюр"СТЭМ".

Шматлікія выступленні нашых мастацкіх калектываў на прэстыжных фестывалях у Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Даніі, Галандыі, Японіі, Кітаі, Сірыі, Грэцыі, Турцыі, Егіпце, Чэхіі, Польшчы, Расіі, на Украіне і іншых краінах прынеслі заслужаную вядомасць, узнагароды і званні.

Яркай старонкай у жыцці не толькі універсітэта, але і нашага горада стала правядзенне Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія". Гэта яшчэ адна сесія не толькі для гомельскіх студэнтаў, але і для іх равеснікаў, для многіх замежных краін, на якой здаецца самы важны экзамен – экзамен на творчую сталасць.

Шырокае прызнанне набыў і Міжнародны маладзёжна-мастацкі салон "XXI стагоддзе", які пашырае звычайныя рамкі духоўных зносін і нават перасягае межы не толькі дзяржаў, але і часу, спрабуючы зазірнуць у будучыню разам з маладымі пісьменнікамі і паэтамі, акцёрамі і рэжысёрамі, кампазітарамі і музыкантамі, мастакамі і архітэктарамі, мадэльерамі і харэографамі.

Мастацкі салон — гэта прыгажосць высокай моды, багацце палітры мастацкіх фарбаў, веліч новай архітэктуры, віртуознасць харэаграфіі, незвычайнасць фотакінакампазіцый, духоўны ўзлёт паэтычнай і пісьменніцкай фантазіі, новая гармонія арыгінальных музычных твораў.

**А.ЛЫСЯНКОЎ,**
**прарэктар па культур-на-асветніцкай рабоце.**

ВУЧЭБНЫЯ ПРАКТЫКІ

## ОТДОХНУЛИ С ПОЛЬЗОЙ ДЛЯ ФОЛЬКЛОРИСТИКИ

Ежегодно по окончании летней сессии студенты-первокурсники филологического факультета отправляются по деревням за фольклором. Они по крупицам собирают то самобытное, исконное, что досталось от дедов и прадедов, что дошло из тех далеких времен, когда деревни назывались весями, а города — местечками. В это лето первокурсников русского отделения отправили в деревни Зябровка, Грабовка, Климовка. Группа Р-11 под руководством ст.преподавателя кафедры русской литературы А.А.Дорофеевой проходила практику в Зябровке. Деревня эта большая (350 дворов, 830 жителей), люди в ней приветливые, отзывчивые, с удовольствием соглашались помочь студентам. Собирали вокруг себя студентов не только седые бабули, но и их дети, внуки. Сказки рассказывали, частушки с задором пели, особенно "забористые", любят и лирические песни. Узнали мы, почему деревня Зябровкой называется, что надо делать, чтобы лад в доме был и многое другое. Принимали нас сердечно, с улыбкой. Солнце пекло — водичкой колодезной угощали, дождь проливной пошел — в дом приглашали. Особенно интересными и теплыми были встречи с О.И.Савченко, Н.Н.Малыновой, Л.И.Михальковой, Л.М.Дятловой, Е.Т.Косточкиной, В.Н.Галинской и др.



Отдохнули мы с пользой для фольклористики. Жаль только, что длилось это всего две недели.

**Марина ДРИБЕНЦЕВА,**
**студентка группы Р-21 филологического факультета.**

## ВАНДРОЎНІКІ Ў АЗЁРНАЙ КРАІНЕ

Вучэбныя планы вну прадугледжваюць міжзанальную практыку. Як правіла, яна звязана з далёкімі паездкамі, каб было потым аб чым расказаць вучням у школе. Ды і наогул, геаграфія — гэта падарожжы.

У былыя часы студэнты-географы (звычайна пасля II курса) выязджалі на міжзанальную практыку ў Крым, на Урал, у Сярэднюю Азію, на Волгу. А вось у нас, у ГДУ, да нядаўняга часу яна (для некалькіх патокаў студэнтаў) праводзілася ... у наваколлі Гомеля. Зразумела, часы цяпер цяжкія, і не тое што на Урал і Карпаты, нават за межы вобласці выехаць нялёгка. Але, калі вельмі пастарацца, штосьці ўсё ж атрымаецца. І вось ужо трэці год запар студэнты-географы ездзяць на практыку ў цудоўны Нарачанскі край.

Нарач — буйнейшае возера Беларусі, з цудоўнымі пляжамі і празрыстай вадой, а навокал лясы і лугі, узгоркі і нізіны, ручаі і рачулкі, дзесяткі іншых азёраў. Нарач — гэта курорт. Нарачанскі край — гэта помнікі гісторыі і культуры: гарадзішчы і старадаўнія сядзібы, цэрквы і касцёлы, манументы і музеі. А сёлета, якраз у апошні дзень практыкі нашых студэнтаў, быў падпісаны ўказ аб стварэнні ў гэтых мясцінах Нарачанскага нацыянальнага парку.

На Нарач звычайна прыязджаюць у санаторыі, дамы адпачынку, пагасцяваць, пакупацца. Але практыка — гэта не прагулка. Ёсць праграма заняткаў, паходаў, экскурсій на кожны дзень. Трэба весці назіранні, фіксаваць у дзённіках вынікі вымярэнняў, браць статыстычную інфармацыю, картаваць маршруты. Ды і быт студэнтаў-практыкантаў — гэта не жамчужныя ванны ў санаторыі, а жыццё ў палатках і харчаванне з кастра (так было ў мінулым і пазамінулым гадах). Сёлета ўдалося ўладкавацца пад дахам школьнай спартзалы.

На далёкія маршруты мы выходзілі з палаткамі. Тады каша дымілася на кастрах каля Блакітных азёраў, на беразе капрызнай Страчы і ў лесе каля возера Швакшты.

Паўночны захад Беларусі — гэта не Гомельскае Палессе. Сёлета яшчэ пашчасціла з сонцам. А летась дажджы ішлі па некалькі дзён запар. У палатках стаяла вада, залівала касцёр, Нарач штарміла. Але затое травы на лугах былі вышэй за пояс! А грыбоў ды ягад не злічыць! Сёлета ж: у Нарачы вада была + $25^0$, купайся хоць да ночы! А хочаш збірай букеты з кветак (па 100-105 відаў) або назірай за святлячкамі і вінаграднымі смаўжамі (пад Гомелем такіх няма). Іншы і рэльеф азёрнай краіны. І елак намнога больш у лясах. І нават летнія ночы карацейшыя і святлейшыя (амаль белыя).

Край Нарачанскі — гэта заходняя Беларусь. Тут пераважаюць хутары. Сярод жыхароў шмат католікаў. Касцёлы ў Мядзелі, Свіры, Канстанцінаве, у в.Нарач — помнікі гісторыі і архітэктуры.

У праграме практыкі былі таксама экскурсіі на біястанцыю, у геафізічную абсерваторыю, гідраметэастанцыю, у лясгас (на яго базе і створаны нацыянальны парк), на Нарачанскі рыбзавод, хлебазавод у Мядзелі. Пабывалі мы і ў буйнейшай фермерскай гаспадарцы Беларусі (В.С.Грыцука).

Сапраўды, такая практыка памятаецца ўсё жыццё. Гэта не руцінныя семінарскія заняткі ў аўдыторыі. І нават апрацоўка і аналіз інфармацыі, атрыманай у раённым аддзеле статыстыкі, у планава-эканамічным упраўленні і экалагічнай інспекцыі райвыканкама, становяцца больш цікавымі, калі за лічбамі бачыш аб'екты, на якіх пабываў, палі і лясы, у якіх блукаў, азёры, у якіх купаўся.

Але ж і заняткі ў час практыкі — не ўвесь дзень. Былі і гульня ў валейбол, і гітара, і магнітафон, і дыскатэка ў Доме адпачынку. Былі і лодка на пракат, і месячная дарожка на Нарачы, пахі ядлаўцовых галінак у кастры і духмянага вятроўніку на лугах.

Для гомельскіх студэнтаў знаходжанне на Нарачы ў час практыкі — гэта сумяшчэнне карыснага з прыемным. І ў гэтым сэнсе многія могуць пазайздросціць "дзіўным" географам, якія ў ліпені не адпачываюць, а вучацца і вандруюць па ўзгорках ваных краях, па дрымучых лясах, па сырых балотах і азёрных краінах. У будучых географаў уражанняў і зараду бадзёрасці застаецца больш, чым у тых, хто два месяцы праседжваў на гарадскім пляжы або стамляў зрок мыльнымі тэлеоперамі.

Калі ёсць змена заняткаў, ёсць, зразумела, і адпачынак, нават калі заняткі гэтыя нялёгкія. І вось пасля такой практыкі, хаця і вяртаюцца студэнты і выкладчыкі дамоў стомленыя, усё ж застаецца пачуццё задавальнення. Бо адчуваеш, што ёсць у гэтым жыцці, у гэтым свеце цудоўныя азёрныя краіны. І тое што яны знаходзяцца ў тваёй роднай Беларусі, — гэта зусім добра!

**А.ПАЎЛОЎСКІ,**
**дацэнт,**
**У.ПАШУК,**
**ст.выкладчык кафедры геаграфіі, кіраўнікі практыкі.**



Нарачанскі край

## НАША БІЯГРАФІЯ: ГОД ЗА ГОДАМ

далёкага і блізкага замежжа.

У ГДУ адкрылася лабараторыя практычнай псіхалогіі, створаная з дапамогай і пры непасрэдным удзеле італьянскага прафесара Гаэтана Барлета. Ва універсітэце высока ацанілі яго падзвіжніцкую дзейнасць. На ўрачыстым пасяджэнні Савета універсітэта рэктар Л.А.Шамяткоў уручыў яму Дыплом аб прысваенні ганаровай ступені доктара псіхалогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

У Франка-Беларускім інстытуце кіравання адбылося чарговае ўручэнне яго студэнтам сертыфікатаў дыпломаў. Вучэбным планам сумеснай міждзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы прадугледжваецца трохразовая іх выдача пасля трох, чатырох і пяці гадоў навучання.

Першы прарэктар ГДУ доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін абраны членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі па аддзяленні прыродазнаўчых навук, а прарэктар па навуковай рабоце доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін — членам-карэспандэнтам па аддзяленні тэхнічных навук.

На працягу снежня праходзіла атэстацыя ГДУ. Прадстаўнічай камісіяй са 170 вучоных і вопытных спецыялістаў рэспублікі было прынята рашэнне аб атэстацыі ГДУ на пяцігадовы тэрмін як вышэйшай навучальнай установы універсітэцкага тыпу.

Чакаецца станоўчае вырашэнне пытання аб наданні ГДУ імя Ф.Скарыны статусу вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі.

**1999**

Адзначыў свой 50-гадовы юбілей факультэт фізічнай культуры. За паўстагоддзе тут падрыхтавана звыш 3 тыс. спецыялістаў фізічнай культуры. На працягу апошніх гадоў факультэт займае першае месца сярод факультэтаў фізічнай культуры ў Рэспубліцы Беларусь па спартыўна-масавай рабоце.

Рэктар універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар Л.А.Шамяткоў стаў першым уладальнікам прэміі за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей адоранай моладзі. Гэта прэмія ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкам.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Ф.Скарыны прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, а калектыў універсітэта за заслугі ў развіцці вышэйшай школы, навукі і культуры ўзнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі асабісты ўклад у развіццё вышэйшай школы медалём "За працоўныя заслугі" ўзнагароджаны прарэктар па навуковай рабоце Д.Р.Лін, загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання І.В.Максімей; медалём Францыска Скарыны — загадчыца кафедры беларускай мовы А.А.Станкевіч.

1 верасня споўнілася 30 гадоў з дня выхаду ў свет шматтыражнай газеты "Гомельскі універсітэт", што з'явілася значнай падзеяй у жыцці шматтысячнага калектыву універсітэта.

Да раней існуючых ва універсітэце спецыяльнасцей дабавілася яшчэ адна — "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны".

На Савеце універсітэта званне Ганаровага прафесара ГДУ прысвоена акадэміку Беларускай акадэміі адукацыі, члену-карэспандэнту НАН Беларусі рэктару Л.А.Шамяткову, загадчыку кафедры педагогікі акадэміку НАН Беларусі І.Ф.Харламаву, прафесару кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнку, прафесару кафедры геаграфіі В.А.Вахрушаву.

ВЕДАЙЦЕ НАШЫХ!



# СЯРОД ЛІРЫКАЎ ДВУХ СТАГОДДЗЯЎ

Маскоўскае выдавецтва "Русский двор" выпусціла ў свет прыгожую кнігу (448 старонак) пад назвай "Белорусская лирика XIX-XX веков в переводах Геннадия Римского". У ёй — творы 59 аўтараў, ад класікаў да сучасных паэтаў.

Па словах В.Рагойшы, атрымалася "аўтарская перакладная анталогія". Цікавыя падборкі Я.Коласа, Я.Купалы, М.Багдановіча, А.Вялюгіна, К.Крапівы, А.Куляшова, П.Панчанкі, М.Танка... Побач Р.Барадулін, Г.Бураўкін, Р.Баравікова, А.Вярцінскі, Н.Гілевіч, С.Грахоўскі, С.Законнікаў, В.Зуёнак, К.Камейша, Г.Каржанеўская, А.Лойка, У.Някляеў, Я.Сіпакоў, У.Скарынкін, Я.Янішчыц. Рэпрэсіраваныя У.Дубоўка, А.Звонак, М.Чарот, Ю.Таўбін, У.Хадыка (з больш чым 200 неабгрунтавана абвінавачаных за гады сталіншчыны беларускіх пісьменнікаў). Паэтаў беларускага замежжа прадстаўляюць Н.Арсеньева, У.Дудзіцкі, А.Салавей, М.Сяднёў. З маладых Г.Рымскі выбраў В.Аколаву, З.Марозава, выпускнікоў нашага універсітэта Э.Акуліна, А.Зэкава, іншыя імёны.

Генадзь Рымскі атрымаў ад выдавецтва "Русский двор" прапанову скласці анталогію беларускай паэзіі за ўсе часы, над якой ён зараз і працуе.

# НА ЎСІМ ЗРАЗУМЕЛАЙ МОВЕ ТАНЦА

Такога грандыёзнага па сваіх маштабах культурнага мерапрыемства ў Гомелі дагэтуль, бадай, яшчэ не было. II Міжнародны фестываль харэаграфіі "Сожскі карагод", у рамках якога прайшло і традыцыйнае свята горада, надоўга падарыў гамяльчанам цудоўны настрой і зарад бадзёрасці. А яшчэ засведчыў: якія б не існавалі цяжкасці ў сённяшнім нашым жыцці, такія фестывалі вельмі неабходны, бо сапраўднае мастацтва ўзвышае і ачышчае нашы душы, дапамагае пераадольваць любыя няпростыя абставіны.

Наш горад жыў святочнай атмасферай на працягу трох цудоўных па надвор'ю верасьнёўскіх дзён. Здаецца, сама прырода радавалася разам з людзьмі прыгажосці мастацтва танца -- як народнага, так і сучаснага, прафесійнага і самадзейнага. Ён сабраў у шумлівы фестывальны карагод дзве тысячы ўдзельнікаў з 12 краін блізкага і далёкага замежжа. Усе яны добра разумелі адзін аднаго, бо танец — ці то беларускі, ці шатландскі або французскі,, — не патрабуе перакладу. Ён незалежна ад нацыянальнасцей, межаў і мытняў — яднае, збліжае людзей.

Канцэртныя залы горада, адкрытыя пляцоўкі па вул.Савецкай, плошча імя Леніна, парк культуры і адпачынку імя Луначарскага былі ў поўным распараджэнні гамяльчан, удзельнікаў і гасцей фестывалю. Тут праходзілі захапляльныя чэмпіянат Еўропы сярод ансамбляў бальна-спартыўнага танца (лацінаамерыканская праграма), адкрыты сусветны турнір бальна-спартыўных пар па еўрапейскіх танцах, канцэрты сучаснай харэаграфіі, дзіцячай творчасці і інш. А гарачых прыхільнікаў балетнага мастацтва парадаваў сваімі спектаклямі на сцэне аблдрамтэатра нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь.



Было чаму здзівіцца і з сапраўдным захапленнем ацаніць работы, якія прадстаўляліся на выставах дэкаратыўна-побытавага і выяўленчага мастацтва Гомельскага Палесся ў "Горадзе майстроў" па вул.Ланге. Ад фантазіі, вытанчанай прыгажосці ўсяго, што зроблена ўмелымі, таленавітымі рукамі, проста перахапляла дух.



Смеласць, спрыт, высокі прафесіяналізм прадэманстравалі ў час паказальных выступленняў у парку, на р.Сож спартсмены, парашутысты, пажарныя. А ад феерычнага шоу, якое адбылося на набярэжнай р.Сож у адзін з фестывальных вечароў, і маляўнічага феерверка ўсе іх відавочцы атрымалі, можна сказаць, лёгкі шок. Так было ўсё захапляюча, прыгожа і незвычайна.

Жадаючых паспець убачыць як мага больш з шырокай фестывальнай праграмы гасцінна сустракалі таксама выставачныя залы горада, дзе былі разгорнуты экспазіцыі карцін нямецкіх мастакоў, работы мастакоў-удзельнікаў міжнароднага скульптурнага пленэра.

Адна з цікавых выстаў была наладжана і ў галоўным корпусе нашага універсітэта пад назвай "Аб вечным", якая рэпрадукцыямі карцін Рэрыха яшчэ раз пераканала наведвальнікаў у тым, што гармонія свету — ва ўсведамленні кожным прыгажосці прыроды, ашчадных адносін да яе.

Меў яшчэ непасрэднае дачыненне да фестывалю "Сожскі карагод" наш універсітэт. Яго актавая зала была ў поўным распараджэнні ўдзельнікаў конкурсу маладзёжных калектываў народна-сцэнічнага танца, а Культурны цэнтр ГДУ па вул. Юбілейнай, які адчыніў свае дзверы пасля рэканструкцыі, запрасіў гасцей фестывалю, студэнтаў, моладзь горада на канцэрт самадзейных артыстаў універсітэта, на святочную дыскатэку.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**На здымках: выступаюць удзельнікі фестывалю "Сожскі карагод" з Беларусі і Грузіі.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

Размышление

# ОСЕННЯЯ РЕАЛЬНОСТЬ

*"Сыплет дождик большие горошины*
*Рвется ветер и даль нечиста,*
*Закрывается тополь взъерошенный*
*Серебристой изнанкой листа..."*

**(Н.Заболоцкий.)**

Да, вот и дождались, друзья, осени. Прошло время солнца, грез и беззаботных дней. Помните те счастливые минуты, проведенные в кругу близких людей теплыми вечерами? Тогда согревали и улыбки. Хотелось петь, быть непринужденным и даже чуть ветреным.

Ах, лето!.. Куда же ты подевалось? Ушло ли ты, ясное наше, по зову кого-то Великого и Могучего в небеса? Или, устав веселить людей своими песнями, улетело вместе с птицами в теплые страны? А, может, просто так надо...

И осень, как строгий учитель, предстала пред нами, чтобы задать свой извечный вопрос: "Как ты жил, человек?"

Задумываются люди и вспоминают... Воспоминания... Кажется, в них погружены не только угрюмые прохожие, старающиеся поплотнее задернуть полы пальто и курток, но даже троллейбусы, спешащие по своим извечным маршрутам. Вот и клены, прощаясь со своим нарядом, погружаются в сладкий полупьяный сон... Сон воспоминаний...

Осенняя печаль... Что же это? Это и плач дождя по ушедшему лету, и вздохи птиц, улетающих неведомо куда; это случайные разлуки влюбленных; озябшие уставшие розы, что продают у магазина... Как холодно им, должно быть. Как холодна осенняя реальность.

Но неужели только она виновата в нашей грусти, внутренней неустроенности и, нередко, плохом настроении?..

Конечно же, нет! Просто надо во всем научиться находить прекрасное. Подумайте только, сколько великих поэтов написали стихов в эту пору, сколько влюбленных нашли друг друга в осеннем вихре листьев и капель, наконец, сколько студентов с радостью начали учебный год? А как, должно быть, уютно и тепло сейчас птицам там, в светлом раю.

И мы, подобно им, способны согреться! Пусть не палящие лучи солнца, а Любовь поможет нам в этом. И когда наши сердца оттают ото льда лжи и усталости, мы вдруг увидим, что дождь плачет от счастья, птицы — от предвкушения покоя, а розы... Им так тепло от дыхания горячих губ...

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ, студентка гр. РБ-23 филологического факультета.**

Служба НТІ інфармуе



# КОНКУРС "НАВУКА-99М"

Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў аб'яўляе конкурс на саісканне грантаў для маладых вучоных "Навука-99М" з мэтай прыцягнення таленавітай моладзі да выканання фундаментальных і пошукавых даследаванняў, стварэння дадатковых стымулаў для эфектыўнай навуковай творчасці і павышэння якасці падрыхтоўкі навуковых кадраў.

Гранты назначаюцца на тэрмін да 2 гадоў асобным маладым вучоным або групам даследчыкаў на выкананне праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў у розных галінах навукі. Склад групы даследчыкаў не павінен перавышаць 4-х чалавек. Пры гэтым адна і тая ж асоба можа быць адначасова кіраўніком толькі аднаго праекта па Фонду, а кожны выканаўца мае права па дадзенаму віду конкурсаў Фонду атрымаць за ўвесь час не больш двух грантаў.

Дубліраванне планавай тэматыкі не дапускаецца.

Праекты, якія ўдзельнічалі ў папярэдніх конкурсах Фонду, да ўдзелу ў конкурсе "Навука-99М" не дапускаюцца.

Гранты Фонду для маладых вучоных прысуджаюцца творча адораным маладым людзям, якія праявілі здольнасці да навукова-даследчай работы і маюць, як правіла, апублікаваныя навуковыя артыкулы.

Саіскальнікамі грантаў для маладых вучоных могуць быць навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 35 гадоў.

Больш дакладна з умовамі ўдзелу ў конкурсе можна азнаёміцца ў інфармацыйнай службе навукова-даследчага сектара ГДУ (п. 4-9, 5-ы корпус, тэл.57-77-11) або на інфармацыйных дошках аб'яў.

Заявы для ўдзелу ў конкурсе прадстаўляць у НДС ГДУ (п. 2-23, 4-ы корпус, тэл.57-82-58) не пазней 15 кастрычніка 1999 года.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — дацэнта, асістэнта;
— гісторыі ўсходнеславянскіх народаў — дацэнта;
— эканамічнай інфарматыкі і АСК — асістэнта (2);
— аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі — ст.выкладчыка (0,25 стаўкі);
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — выкладчыка;
— лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — дацэнта;
— матэматычнага аналізу — дацэнта;
— французскай мовы — заг.кафедры;
— усеагульнай гісторыі — заг.кафедры;
— радыёфізікі — заг.кафедры;
— рускай літаратуры — заг.кафедры;
— грамадзянска-прававых дысцыплін — заг.кафедры.

Тэрмін падачы заяў —не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры палітычнай сацыялогіі выказваюць глыбокае спачуванне кандыдату філасофскіх навук, дацэнту названай кафедры **КАСЬЯНЕНКУ** Анатолю Пятровічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыку **БАКУНОВІЧУ** Юрыю Мікалаевічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 487.
Падпісана да друку ў 15.00 27.09.1999 г.